# МЕДЫЙНАЯ КАНЦЭПТАСФЕРА БЕЛАРУСІ: СТРУКТУРАВАНАСЦЬ І СІСТЭМНАСЦЬ

***М. А. Груздзева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*mgruzdeva312@gmail.com*

У артыкуле вывучаецца з’ява структураванасці медыйнай канцэптасферы Беларусі. Аналізуюцца асноўныя падыходы да вылучэння арганізацыі канцэптасферы, на іх аснове фармулюецца аўтарскі метад даследавання структуры медыйнай канцэптасферы. Прадмет даследавання вывучаўся на матэрыяле слоўнікавых артыкулаў як крыніц зафіксаванага значэння слоў і на матэрыяле медыятэкстаў як прасторы для інтэрпрэтацый. У артыкуле прапанавана паэтапная методыка вывучэння структуры медыйнай канцэптасферы, выкарыстанне якой дазволіла выявіць, што гэта мнагамернае ментальнае ўтварэнне прадстаўлена групамі медыяканцэптаў, што маюць палявую структуру.

***Ключавыя словы:*** медыя; канцэптасфера; структура; сістэма; медыйная канцэптасфера Беларусі; канцэпт; медыятэкст; интэрпрэтацыя.

# THE STRUCTURE OF THE MEDIA CONCEPTOSPHERE IN BELARUS: STRUCTURED AND SYSTEMIC

***M. A. Gruzdeva***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: M. A. Gruzdeva (mgruzdeva312@gmail.com)*

The article studies the phenomenon of structurization of the media conceptosphere of Belarus. The main approaches to the selection of the organization of the conceptosphere are analyzed, and on that basis the author’s method of studying the structure of the media conceptosphere is formulated. The subject of the study was studied on the material of dictionary articles as sources of recorded meanings of words and on the material of media texts as a space for interpretation. The article offers a phased methodology for studying the structure of the media conceptosphere, the use of which revealed that this

multidimensional mental formation is represented by groups of media concepts that have a field structure.

***Key words:*** media; conceptosphere; structure; system; media conceptosphere of Belarus; concept; media concept; interpretation.

Медыйная канцэптасфера ўяўляе сабой сукупнасць кагнітыўных адзінак (медыяканцэптаў) у свядомасці суб'екта камунікацыі, якая рэпрэзентуе рэчаіснасць у медыядыскурсе з дапамогай тэкстаў сродкаў масавай камунікацыі (СМК). Існаванне мноства канцэптаў у межах медыйнай канцэптасферы, што падкрэсліваецца ў гэтым азначэнні, прадугледжвае неабходнасць даследавання яе структуры. Медыйную канцэптасферу разглядаем як падвід нацыянальнай канцэптасферы, таму пры выяўленні ўнутранай арганізацыі паданалізнай з'явы абапіраемся на падыходы да вылучэння структуры канцэптасферы, якія прапанаваны ў працах розных даследчыкаў.

Структураванасць канцэптасферы дапускае наяўнасць сувязей і адносін паміж яе адзінкамі ўнутры сістэмы. Гэта пацвярджаюць З. Д. Папова і І. А. Сцярнін, якія адзначаюць, што «канцэпты, якія ўтвараюць канцэптасферу, па асобных сваіх прыкметах уступаюць у сістэмныя адносіны падабенства, адрознення і іерархіі з іншымі канцэптамі» [1, с. 18]. Сярод падыходаў да выяўлення арганізацыі сістэмы кагнітыўных адзінак вылучаюць палявы, іерархічны, аксіялагічны і інш.

Прыхільнікі палявога прынцыпу пабудовы пастулююць, што ў канцэптасферы вылучаецца цэнтральная (ядравая) і перыферыйная часткі. У цэнтры канцэптасферы знаходзяцца найбольш тыповыя для камунікантаў канцэпты, а ў перыферыі – нетыповыя, нерэлевантныя, індывідуальныя кагнітыўныя адзінкі. Так, В. А. Маслава адзначае: «У структуры канцэптасферы ёсць ядро (кагнітыўна-прапазітыўная структура важнага канцэпту), прыядзерная зона (іншыя лексічныя рэпрэзентацыі важнага канцэпту, яго сінонімы і г. д.) і перыферыя (асацыятыўна-вобразныя рэпрэзентацыі)» [2, с. 35]. Канстатуем таксама, што ў гэтым падыходзе, нягледзячы на вылучэнне пэўных палёў у канцэптасферы, выразнага падзелу межаў гэтых зон не прасочваецца.

У іерархічным падыходзе канцэптасфера разглядаецца як сістэма ўзроўняў. Напрыклад, М. Ю. Аляшкоў вылучае семантычны (канструюецца «паслядоўнай сукупнасцю кагнітыўных утварэнняў: *паняцце – значэнне – сэнс – канцэпт – канцэптасфера*») і фармальны (пададзены «сукупнасцю статычных і дынамічных кагнітыўных структур (канцэптаў), якія вербалізуюцца з дапамогай сэнсавага напаўнення трансляваных

моўных адзінак») узроўні ў арганізацыі канцэптасферы [3, с. 71]. Такое тлумачэнне яе структуры мае на ўвазе даследаванне знешніх сувязяў з іншымі кагнітыўнымі ўтварэннямі, а таксама вывучэнне ўнутранай пабудовы – канцэптаў.

Калі кажуць пра аксіялагічны прынцып арганізацыі канцэптасферы, мяркуюць, што кагнітыўныя адзінкі, якія ўваходзяць у канцэптасферу, можна размеркаваць па ступені іх значнасці (каштоўнасці) для носьбітаў мовы. Навукоўцы сцвярджаюць, што «магчымасць размеркавання іх [канцэптаў] на галоўныя і другарадныя, больш-менш яркія для нацыянальнай свядомасці цалкам відавочная» [4, с. 115]. Гэта значыць, аксіялагічны складнік кагнітыўных адзінак, якія пададзены ў канцэптасферы, прызнаецца асноўным пры вылучэнні яе структуры.

Прызнаем вартасці іерархічнага прынцыпу арганізацыі для рознабаковага разгляду канцэптасферы, аднак лічым, што ў нашым даследаванні такі шырокі падыход немэтазгодны. Пры вывучэнні структуры медыйнай канцэптасферы выкарыстоўваем палявы і іерархічны падыходы. У гэтым мнагамерным ментальным утварэнні вылучаем групы канцэптаў (сем’і канцэптаў, мегаканцэпты [5, с. 12]), якія складаюцца з кампанентаў-канцэптаў, што маюць палявую структуру. У якасці ядра выступаюць медыяканцэпты, якія адлюстроўваюць тыповыя (аксіялагічна важныя) для носьбітаў мовы ўяўленні пра пэўныя з’явы і ўваходзяць у нацыянальную канцэптасферу як ключавыя канструкты. У прыядзерную зону медыйнай канцэптасферы ўключаем медыяканцэпты, якія таксама з’яўляюцца значнымі, але «не ўключанымі» ў нацыянальную канцэптасферу. Да перыферыі ж медыйнай канцэптасферы адносім меней рэлевантныя для прадстаўнікоў нацыі медыяканцэпты, якія пазбаўлены аб’ёму фонавых ведаў і маюць абмежаваны «жыццёвы цыкл».

Для таго каб выявіць асноўныя канцэпты, што складаюць структуру медыйнай канцэптасферы Беларусі, звернемся спачатку да спосабаў іх вывучэння. Адзначым, што канцэпт – гэта «згустак культуры» (Ю. С. Сцяпанаў [6, с. 14]), «згустак сэнсаў» (В. А. Маслава [2, с. 53]), значыць, гэта структура ведаў, якая складаецца з мноства адзінак, аднак у мэтах даследавання канцэпт разглядаецца праз ключавое слова – галоўную вербалізацыю канцэпту. Канцэпты вывучаем на матэрыяле слоўнікавых артыкулаў як крыніц зафіксаванага значэння ключавых слоў і на матэрыяле медыятэкстаў як прасторы для інтэрпрэтацый. Слоўнікавыя тлумачэнні дазваляюць даследаваць семантычную структуру ключавых словаў канцэпту, якая ад-

люстравана ў свядомасці большасці носьбітаў мовы. З дапамогай аналізу вербалізацый канцэпту ў медыятэкстах устанаўліваюцца яго парадыгматычныя (сінанімічныя, антанімічныя, асацыятыўныя) і сінтагматычныя (спалучальнасны патэнцыял) сувязі. Акрамя таго, на матэрыяле тэкстаў СМК эксплiцытны змест канцэпту дапаўняецца і ўдакладняецца імпліцытнымі характарыстыкамі, таму становіцца магчымым разгляд рэалізацыі канцэпту ў дыскурсе (маўленчая дзейнасць у сацыяльнай прасторы), дзякуючы чаму змест канцэпту ўзбагачаецца новымі значэннямі і актуальнымі сэнсамі.

Структура медыйнай канцэптасферы Беларусі даследавалася на матэрыяле грамадска-палітычных друкаваных СМК («Звязда», «СБ. Беларусь сегодня», «Рэспубліка», «Народная газета», «Сельская газета»). Выбар гэтага тыпу газет абумоўлены іх універсальнасцю, разнатэмнасцю і пашыранасцю на тэрыторыі краіны. Маніторынг праводзіўся з 15 кастрычніка па 15 лістапада 2021 года. Выкарыстанне гэтага перыяду, з аднаго боку, дазваляе актуалізаваць  атрыманыя вынікі, а з другога боку, дае дастатковую колькасць даных для атрымання карэктных высноў, таму што ключавыя канцэпты (якія і ўяўляюць для нас цікавасць) з’яўляюцца адносна пастаяннымі і адлюстроўваюць важныя для пэўнай супольнасці (у нашым выпадку – беларусаў) паняцці. У выніку было прааналізавана 850 матэрыялаў з пазначаных перыядычных выданняў.

Арганізацыю беларускай медыйнай канцэптасферы мэтазгодна вывучаць з дапамогай наступнай паэтапнай методыкі: 1) вылучэнне ў тэкстах слоў, якія паўтараюцца, даследаванне іх сувязей з іншымі словамі; 2) на аснове вылучаных слоў выяўленне аднаго ключавога слова (вербалізацыі канцэпту) для кожнага матэрыялу: пры адборы асноўнымі прыкметамі ключавога слова прызнаваліся частотнасць ужывання, здольнасць згортваць інфармацыю, наяўнасць парадыгматычных, сінтагматычных і дыскурсіўных сувязей з іншымі словамі; 3) аналіз семантычных структур моўных рэпрэзентацый канцэптаў па слоўнікавых артыкулах; 4) устанаўленне аксіялагічных характарыстык выяўленых канцэптаў для іх структурнай дыферэнцыяцыі.

Прапанаваная методыка пакладзена ў аналіз медыйнай канцэптасферы Беларусі на адзначаным вышэй матэрыяле. У выніку выяўленыя канцэпты былі аб’яднаны ў тэматычныя групы і размеркаваны ў адпаведнасці са значнасцю для носьбітаў мовы (падстава – частотнасць выкарыстання). Былі вызначаны 8 груп канцэптаў. Гэтыя канцэпты і складаюць беларускую медыйную канцэптасферу ў азначаны пе-

рыяд часу. Унутры гэтых груп вылучаем структурныя элементы: ядро, прыядзерную зону і перыферыю (гл. табліцу).

*Табліца*

**Структура медыйнай канцэптасферы Беларусі**

| **Назва групы канцэптаў** | **Слоўнікавае значэнне** | **Структура** |
|---|---|---|
| Беларусь | Дзяржава ва Усходняй Еўропе [8, с. 63] | *Ядро:* Беларусь, беларускі. *Прыядзерная зона:* Рэспубліка Беларусь, беларусы. *Перыферыя:* наша краіна, радзіма |
| Грамадства | Сукупнасць людзей, аб'яднаных гістарычна абумоўленымі сацыяльнымі формамі сумеснага жыцця і дзейнасці [8, с. 197] | *Ядро:* насельніцтва, рэгіёны, сацыяльны. *Прыядзерная зона:* праца, здарэнні, моладзь. *Перыферыя:* пенсіянеры, грамадзянская супольнасць, інваліды |
| Знешняя палітыка | Знешняя палітыка належыць да сферы зносін паміж дзяржавамі [9] | *Ядро:* Расія, міжнародны, расійскі. *Прыядзерная зона:* еўрапейскі, сусветны. *Перыферыя:* Кітай, Саюзная дзяржава, Еўрапейскі Саюз |
| Здароўе | Правільная, нармальная дзейнасць арганізма [8, с. 298] | *Ядро:* медыцына, COVID-19, каранавірус. *Прыядзерная зона:* урач, вакцына, спорт. *Перыферыя:* імунітэт, вірус |
| Унутраная палітыка | Унутраная палітыка ахоплівае асноўныя кірункі дзейнасці дзяржавы, партый (эканамічная, сацыяльная, культурная, тэхнічная палітыка і інш.) [9] | *Ядро:* Прэзідэнт, урад, закон. *Прыядзерная зона:* парламент, суд. *Перыферыя:* Савет Міністраў, Савет Рэспублікі, Канстытуцыя |
| Эканоміка | Сукупнасць вытворчых адносін, якія адпавядаюць дадзенай ступені развіцця прадукцыйных сіл грамадства, пануючы спосаб вытворчасці ў грамадстве [8, с. 951–952] | *Ядро:* прадпрыемства, будаўніцтва. *Прыядзерная зона:* кампанія, сельская гаспадарка. *Перыферыя:* бізнес, газ |
| Навука | Сістэма ведаў аб заканамернасцях развіцця прыроды, грамадства і мыслення, а таксама асобная галіна гэтых ведаў [8, с. 450] | *Ядро:* развіццё, веды. *Прыядзерная зона:* тэхналогіі, адукацыя. *Перыферыя:* навуковец, універсітэт, інфармацыйныя тэхналогіі |
| Культура | Сукупнасць дасягненняў чалавецтва ў вытворчым, грамадскім і разумовым жыцці [8, с. 384] | *Ядро:* гісторыя. *Прыядзерная зона:* літаратура, мастацтва, традыцыі. *Перыферыя:* адзінства, патрыятызм |

Медыйная канцэптасфера Беларусі – мнагамернае ментальнае ўтварэнне, якое прадстаўлена групамі медыяканцэптаў, што маюць палявую структуру. Восем груп канцэптаў – Беларусь, грамадства, знешняя палітыка, здароўе, унутраная палітыка, эканоміка, навука, культура – рэпрэзентуюцца ў кожным з разгледжаных СМК. Медыяканцэпты ядра вербалізуюцца ў большасці матэрыялаў тэматычнай групы, яны валодаюць здольнасцю да кандэнсацыі (заключэнню ў сабе) інфармацыі і ствараюць сувязі living рознага характару з іншымі элементамі тэксту. Частотнасць выкарыстання медыяканцэптаў прыядзернай зоны істотна ніжэйшая у параўнанні з вербалізацыямі ядра, іншыя ж іх характарыстыкі супадаюць. У перыферыю груп канцэптаў уваходзяць складнікі, якія рэпрэзентаваліся толькі ў некаторых з паданалізных матэрыялаў, гэтыя медыяканцэпты не заўсёды адрозніваюцца здольнасцю да сціскання інфармацыі і разнастайнымі сувязямі. Адзначым таксама, што ў перыферыю мы ўключылі тыя медыяканцэпты, якія сустракаліся больш за адзін раз, многія канцэпты выкарыстоўваліся толькі аднойчы. Мяркуем, што пры вывучэнні медыятэкстаў на працягу большага працяглага перыяду элементы перыферыі будуць змяняцца і дапаўняцца.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Попова З. Д., Стернин И. А*. Очерки по когнитивной лингвистике. Воронеж, 2001. 191 с.
2. *Маслова В. А*. Введение в когнитивную лингвистику. М.: Флинта, Наука, 2007. 293 с.
3. *Олешков М. Ю.* Лингвоконцептуальный анализ дискурса (теоретический аспект) // Дискурс, концепт, жанр: коллективная монография / отв. ред. М. Ю. Олешков. Нижний Тагил, 2009. С. 68–85.
4. *Попова З. Д., Стернин И. А*. Когнитивная лингвистика и лингвокультурология // Филологические записки. 2001. Вып. 16. С. 112–120.
5. *Степанов Ю. С*. Константы. Словарь русской культуры. Опыт исследования. М.: Языки русской культуры, 1997. 824 с.
6. *Зырянова М. Н*. Мегаконцепт ‘творчество’ в поэтической модели мира Д. А. Пригова: автореф. дис. … канд. филол. наук. Омск, 2011. 26 с.
7. *Поспелов Е. М.* Географические названия мира: Топонимический словарь. 2-е изд., стереотип. М., 2002. 512 с.
8. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / уклад.: І. Л. Капылоў [і інш.]; пад рэд. І. Л. Капылова. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2016. 968 с.
9. Чалавек і грамадства: Энцыклапедычны даведнік. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1998 [Электронны рэсурс]. URL: http://www.slounik.org/155530.html (дата звароту: 10.11.2021).